Леанід КАСІНСКІ:

Даслоўна

# «Недахопу патрыётаў у Беларусі няма»

## На тэрыторыі Брэсцкай крэпасці-героя з'явіцца Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі

**Гэта будзе найбуйнейшая выхаваўча-асветніцкая пляцоўка, якая аб'яднае не толькі школьнікаў з усёй Беларусі, а і падлеткаў з іншых дзяржаў. Што будзе ўяўляць з сябе цэнтр, якія ў яго мэты і, галоўнае, чаму ён неабходны сучаснаму пакаленню беларусаў — пра гэта карэспандэнт «Звязды» распытала ў памочніка міністра абароны па ідэалагічнай рабоце — начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёра Леаніда КАСІНСКАГА. Акрамя таго, пагаварылі з заслужаным спецыялістам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (такое высокае званне днямі было прысвоена Леаніду Віктаравічу загадам кіраўніка дзяржавы) аб прэстыжы воінскай службы, патрыятычным выхаванні і пачуцці адказнасці за Радзіму.**



Леанід КАСІНСКІ з партрэтам свайго дзеда, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

***— Леанід Віктаравіч, ініцыятыва стварэння Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі належыць Міністэрству абароны. Месца абралі сімвалічнае. У чым галоўная місія цэнтра?***

— Сама зямля ў Брэсцкай крэпасці святая — лепшага месца для патрыятычнага цэнтра не знайсці. Прычым тут ёсць і пэўная матэрыяльная база, якую можна абнавіць. Асноўная мэта цэнтра — патрыятычнае выхаванне. Калі хтосьці думае, што мы апранем дзяцей у ваенную форму і яны будуць маршыраваць, а таксама спяваць ваенныя песні, то гэта абсалютна не так. Ужо прыкідваючы праграму навучання і падрыхтоўкі ў цэнтры, на вайсковыя дысцыпліны будзе адводзіцца не больш чым 40 % навучальнага часу. Калі ў войска сёння прыходзяць маладыя людзі і пачынаеш у іх пытацца пра гістарычнае мінулае, то некаторыя яшчэ штосьці ведаюць. Калі ж высвятляеш, што яны могуць расказаць пра 30-гадовы перыяд беларускага суверэнітэту і незалежнасці, амаль ніхто нічога не можа адказаць пра нашы дасягненні. А нам ёсць чым ганарыцца. Многія дзяржавы са шматвяковай гісторыяй суверэнітэту і незалежнасці не змаглі дамагчыся такіх поспехаў, якіх дасягнуў беларускі народ за адносна невялікі перыяд часу. Некаторыя маладыя людзі ўспрымаюць усё тое, што мы маем, як нейкую данасць, і часта пытаюцца, чаму мы ганарымся тым, што не галадаем. Гэтым трэба ганарыцца — тыя, хто помніць пачатак 1990-х, ведае: тое, што ў нас ёсць, мы дасягнулі сваёй працай. Калі я вучыўся на Урале, там пачуў такую прымаўку: «Цяжка растлумачыць чалавеку смак солі, калі ён усё жыццё еў мёд». Так і з моладдзю, у якой сёння ёсць усё.

***— Атрымліваецца, ёсць пэўныя прабелы ў патрыятычным выхаванні?***

— Многія пытанні работы з маладымі людзьмі, на жаль, упушчаны. Але, нягледзячы на гэта, недахопу патрыётаў у Беларусі няма. Гэта паказала наша гісторыя, у тым ліку мінулагодні падзеі. Сёння многія гавораць аб тым, што патрыятызм павінен быць абавязкова «ў пагонах»: людзі лічаць, што патрыятычным выхаваннем павінны займацца выключна вайскоўцы, увогуле сілавыя структуры. Дазволю сабе не пагадзіцца: ваенна-патрыятычнае выхаванне — усяго толькі невялікая частка патрыятычнага выхавання. А яно пачынаецца з сям'і, з дзіцячага садка, са школьнай лаўкі. Патрыятызм — аснова ўсяго.

***— Што будзе ўяўляць з сябе цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі?***

— У цэнтры будуць займацца дзеці ва ўзросце ад 12 да 16 гадоў. У меншай ступені, мы плануем прыцягваць сюды тых, хто ўжо вывучае прадмет «дапрызыўная падрыхтоўка». У большай, імкнёмся зрабіць так, каб цэнтр стаў трамплінам да ўсведамлення сябе патрыётам. Гэта не будзе цэнтр выключна для беларускіх дзяцей. Згодна з першаснымі разлікамі, адначасовае знаходжанне ў цэнтры разлічана на 300 — 500 чалавек з нарошчваннем колькасці і магчымасцяў у летні перыяд дзякуючы выкарыстанню модульных будынкаў і канструкцый, палатачнага фонду. Тыя аб'екты, якія мы плануем выкарыстоўваць пад сталовую, здольныя забяспечыць харчаванне да 800 чалавек. Мы даследуем і памяшканні на тэрыторыі Брэсцкага гарвыканкама, якія таксама можам выкарыстаць пад навучанне, размяшчэнне выхаванцаў цэнтра. Галоўнае, каб гэта было цікава сучаснай моладзі. Сёння многія кажуць: «Трэба дзяцей выцягваць з гаджэтаў». Позна! Мы павінны «зайсці» ў гэтыя гаджэты з тымі рэчамі, якія будуць для іх цікавымі і пазнавальнымі, з дапамогай якіх дзеці даведаюцца пра гісторыю не тую, якую некаторыя СМІ ім спрабуюць навязаць, а праўдзівую. Мы свядома прыцягнулі для распрацоўкі праграм, камп'ютарных дадаткаў, а таксама гульнявых квэстаў курсантаў Ваеннай акадэміі. Плануем абсталяваць трэнажорныя залы, паставіць самую сучасную камп'ютарную тэхніку, з дапамогай якой школьнікі змогуць правесці час і выкарыстаць яе для дыстанцыйнага навучання падчас свайго знаходжання ў цэнтры. Часам становіцца страшна ад такой колькасці ідэй, якія сёння ёсць. Хочацца ўсё рэалізаваць. Са сваімі прапановамі да нас звяртаюцца і неабыякавыя жыхары Брэста. Несумненна, усё гэта мы будзем улічваць пры будаўніцтве і стварэнні базы цэнтра.

***— Ці не з'яўляецца гэта інтрыгай: калі ён зможа прыняць сваіх першых наведвальнікаў?***

— Рэканструкцыю і будаўніцтва аб'ектаў цэнтра мы размеркавалі на некалькі этапаў. Гэты год у нас адведзены на складанне праектнай дакументацыі, у цэлым распрацоўку праекта. У наступным пачнуцца работы па будаўніцтве і рэканструкцыі тых аб'ектаў, якія ўжо ёсць. Першая чарга павінна пачаць работу не пазней за 2023 год. Гэта не дазволіць прыняць запланаваную колькасць дзяцей, але працэс ужо будзе запушчаны.

***— На тэрыторыі Брэсцкай крэпасці з'явяцца новыя будынкі?***

— Брэсцкая крэпасць — аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны нулявой катэгорыі. Таму ўсё, што звязана з будаўніцтвам, мае шэраг абмежаванняў. Мы паспрабуем максімальна захаваць тыя гістарычныя аб'екты, якія ўжо існуюць на Кобрынскім умацаванні, каб гэтую базу можна было выкарыстаць у інтарэсах ваенна-патрыятычнага выхавання. У хуткім часе там пачнуць працаваць вайскоўцы 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна. Таксама праверым мясцовасць на наяўнасць выбухованебяспечных рэчываў, археалагічных знаходак. Стварэнне цэнтра — не толькі добры падмурак у патрыятычным выхаванні нашай моладзі, а яшчэ і захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцяў, самой Брэсцкай крэпасці, якая паступова прыходзіць да заняпаду.

***— Апошнім часам паняцце патрыятызму ў нашай краіне дэфармавалася. Некаторыя, называючы сябе «патрыётамі», дзейнічаюць не на карысць дзяржаве, а выступаюць супраць яе, свайго народа. Як адрозніць сапраўдны патрыятызм ад правакацыі?***

— Калі заглянуць у гісторыю, гэтая сітуацыя мне нагадвае канец XVIII — пачатак XIX стагоддзя ў Вялікабрытаніі, калі людзі раздзяліліся і пачалі высвятляць, хто з іх найбольш патрыятычны. Патрыёт — гэта не той, хто крычыць. Патрыятызм пазнаецца не ў словах, а ва ўчынках, тых справах, якія ты робіш. У класічным разуменні патрыятызм — гэта любоў да Радзімы. Я не разумею, як некаторыя гавораць: «Я сваю Радзіму люблю, але яна не такая, якой я яе ўяўляю». Для мяне раўназначна сказаць: «Я сваю маму люблю, але яна не такая...» Паняцці «Радзіма» і «маці» абсалютна непадзельныя. Маму, як самага дарагога чалавека, мы прымаем такой, якая яна ёсць. Тое ж самае і з Радзімай — мы павінны яе прымаць і імкнуцца зрабіць усё дзеля таго, каб яна стала лепшая. Калі хтосьці зыходзіць з іншых меркаванняў, гэта ўжо не патрыёт, а чалавек, які працуе на публіку. Для мяне гэта святая зямля: я тут нарадзіўся і вырас, тут жылі мае продкі, мы ўпершыню за шматвяковую гісторыю атрымалі суверэнітэт і незалежнасць. Цяпер тое, што мы будавалі 30 гадоў, важна развіваць далей і перадаць нашым дзецям. А для таго каб яны былі гатовыя прыняць гэта, з імі трэба працаваць.

***— Магчыма, з такой задачай справяцца выкладчыкі цэнтра патрыятычнага выхавання, бо прадмет «дапрызыўная падрыхтоўка» сёння, на мой погляд, не зусім эфектыўны...***

— Дапрызыўная падрыхтоўка — не панацэя. Гэта ўсяго толькі элемент фарміравання ў маладога чалавека гатоўнасці абараняць сваю Айчыну, каб, ідучы ў армію, ён разумеў, што гэта патрэбна яму, яго сям'і, яго краіне. Нам не хапае таго, калі чалавек з дзяцінства ўсведамляе, чаму яго краіна найлепшая ў свеце, чаму ён павінен ёй ганарыцца. Кіраўнік дзяржавы часта кажа аб тым, што патрыятызм сілком не ўваб'еш у чалавека. І ніхто не збіраецца гэтага рабіць.

***— Тым не менш, важным складнікам, які ўплывае на баяздольнасць арміі, з'яўляецца баявы дух яе асабовага складу...***

— З першых дзён у арміі хлопцам даюць зразумець, што дзяцінства скончылася, і сёння яны — людзі, на плячах якіх ляжыць пэўная адказнасць. І не толькі за сябе, а ў тым ліку за тых маладых людзей, якія знаходзяцца побач, адказнасць за дзяржаву ў цэлым. На жаль, не ўсе юнакі, якія прайшлі на вайсковую службу, адразу ўсведамляюць, што яны выконваюць вельмі важную ролю. Армія — гэта апорная канструкцыя дзяржавы. І маладыя людзі падчас службы, выконваючы задачы, якія на іх ускладзены, у сваіх воінскіх калектывах разумеюць гэта. Мы не хаваем, што да нас прыходзяць і маладыя людзі са сваімі перакананнямі, некаторыя з іх удзельнічалі ў тых пратэсных акцыях, якія адбываліся летась. У арміі яны пачынаюць сваё жыццё з чыстага ліста. Большасць з гэтых юнакоў ужо пасля першых месяцаў службы становіцца сапраўднымі патрыётамі сваёй краіны.

***— А ці з ахвотай маладыя людзі сёння ідуць у армію?***

— Нельга сказаць, што ў савецкі час усе з вялікім жаданнем ішлі ў армію. Проста было менш магчымасцяў неахвоту некаторых прызыўнікоў выносіць на публіку. Воінская служба звязана з вялікай колькасцю абмежаванняў. Рэдка які чалавек здольны добраахвотна выйсці з зоны камфорту і пагрузіцца ў тыя фізічныя і эмацыянальныя нагрузкі, якія існуюць у войску. Таму мы не будзем сябе падманваць у тым, што ўсе пагалоўна хочуць ісці ў армію. Але мы можам канстатаваць тое, што адносіны бацькоў рэзка памяняліся і пераважная большасць з іх толькі «за», каб іх сыны адслужылі. Наўрад ці гэта звязана з пакетам тых прэферэнцый, якія пры падтрымцы Прэзідэнта мы рэалізавалі за апошнія тры гады. Мала хто з маладых людзей сёння задумваецца аб тым, што тэрмін службы ў арміі залічваецца ў страхавы стаж пры наліčэнні пенсіі. Заканадаўча замацавана і тое, што хлопцы, якія адслужылі і атрымалі рэкамендацыю камандзіраў устаноўленага ўзору, могуць за кошт дзяржавы праходзіць навучанне на падрыхтоўчых курсах пры паступленні ў вышэйшую навучальную ўстанову. Карыстаюцца яны і першачарговым правам атрымання інтэрната. Гэтая катэгорыя грамадзян мае прыярытэт і падчас выбару месца размеркавання. Акрамя таго, вызначаны пералік спецыяльнасцяў, на якія ваеннаслужачыя, што прайшлі тэрміновую службу, маюць права першачарговага залічэння па-за конкурсам. Пацвярджэннем таго, што прэстыж воінскай службы расце, служыць у першую чаргу тое, што маладыя людзі актыўна працягваюць службу па кантракце — прычым як пасля тэрміновай службы, так і без яе, заключаючы кантракт з першага дня ў войску. Істотна і тое, што ў арміі сёння можна атрымаць спецыяльнасці, з якімі ты будзеш запатрабавальным і ў цывільным жыцці. Асабліва гэта характэрна для транспартных войскаў. Пасля службы ў такіх часцях хлопцы вяртаюцца дадому з дадатковай адукацыяй і з адпаведнай «скарыначкай», працягваюць працаваць па атрыманай спецыяльнасці. Вядома, наша пазіцыя — чалавек павінен абараняць Радзіму не за «пернікі», але мы зыходзім з таго, што хлопец, які шчыра выканаў свой абавязак перад Айчынай, павінен быць больш абаронены перад тымі, хто не прайшоў гэтую школу.

***— Ці карысны для нас замежны вопыт выхавання моладзі ў духу любові да Радзімы, адказнасці за яе будучыню?***

— Пытанні той жа дапрызыўнай падрыхтоўкі (толькі называецца яна інакш) вывучаюцца і ў іншых краінах. Ва Узброеных Сілах Ізраіля такі падыход: маладых людзей, якія прыходзяць у войска, вязуць, напрыклад, у Польшчу і паказваюць канцэнтрацыйныя лагеры, вымаўляючы ўсяго адну фразу: «Так бывае з нацыяй, якая не ўмее сябе абараняць». І больш нічога гаварыць не трэба. Мы павінны працаваць з моладдзю і даносіць ёй праўдзівую інфармацыю — і не ў выглядзе пэўных разавых акцый, а на сістэмнай аснове. Па вялікім рахунку, выбудаваная структура ідэалагічнай работы, замацаваная заканадаўча, якая ёсць толькі ў сілавых ведамствах, вельмі эфектыўная.

***— На думку Прэзідэнта Беларусі, ідэалогія для дзяржавы — тое ж самае, што імунная сістэма для жывога арганізма: «калі імунная сістэма слабее, любая, нават самая нязначная інфекцыя, становіцца смяротнай». Як нам не дапусціць збою ў «імуннай сістэме» нашай краіны?***

— Гэтае выказванне нашага Галоўнакамандуючага вельмі добра падкрэслівае сутнасць ідэалагічнай работы. Гісторыя паказвае: калі ў «імуннай сістэме» адбываецца збой, ад дзяржавы застаецца толькі пазнака на карце. Дастаткова прыкладаў, калі збой прыводзіць да таго, што навокал — разруха, кроў, развальваецца эканоміка: па сутнасці, краіна перастае існаваць. І для таго каб гэтага не дапусціць, патрэбна «імунная сістэма», стрыжнем якой з'яўляецца патрыятызм. Сёння можна шмат спрачацца, у чым для нас нацыянальная ідэя. На мой погляд, яна — у захаванні незалежнасці і суверэнітэту дзяржавы. Многія нашы суседзі, якія актыўна вядуць супраць нас дэструктыўную дзейнасць, хваляцца сваёй незалежнасцю, хоць, на маю думку, іх незалежнасць толькі ў тым, што ад іх нічога не залежыць: пазіцыянуючы сябе незалежнымі, яны нават кроку не могуць зрабіць без сваіх куратараў. Мы ж захавалі краіну і паказалі ўсяму свету, што маленькая, але гордая дзяржава ў цэнтры Еўропы нікому не дазволіць нам указваць. Толькі беларускі народ можа выбіраць, як яму жыць.

Захад-2021

# Наперадзе — адказны час

### Расійскія вайскоўцы, якія задзейнічаны ў сумесным стратэгічным вучэнні, прыбываюць у Беларусь

**Расійска-беларускае вучэнне «Захад-2021» пройдзе на палігонах дзвюх краін з 10 да 16 верасня. Тэма манеўраў — «Прымяненне груповак войскаў (сіл) у інтарэсах забеспячэння ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы».**

У нашу краіну ўжо прыбываюць эшалоны з расійскімі вайскоўцамі, а таксама тэхнікай. У прыватнасці, на чыгуначную станцыю «Лясная» ў Баранавіцкім раёне былі дастаўлены падраздзяленні тэхнічнага і тылавога забеспячэння. «Прыемна, што нас так цёпла сустрэлі нашы беларускія браты, — лічыць падпалкоўнік расійскай арміі Аляксей Сталяроў. — Наперадзе ў нас па-сапраўднаму насычаная работа. Упэўнены, што ўдзел у маючым адбыцца вучэнні дазволіць абодвум бакам атрымаць каштоўны вопыт».

— Прыехалі з добрым настроем, дабраліся на працягу сутак, праблем у ходзе пераезду не было, — расказвае намеснік камандзіра адной з вайсковых часцей Расійскай Федэрацыі Сяргей Каброў. — Сустрэлі нас з аркестрам, нам вельмі прыемна. Была аказана дапамога ў арганізацыі разгрузкі нашай тэхнікі. Я рады, што прыбыў на беларускую зямлю са сваім асабовым складам. Наша падраздзяленне рэгулярна ўдзельнічае ў буйных стратэгічных вучэннях.

Ноу-хау

# Адслужыць падчас вучобы

## Разам з дыпломам аб вышэйшай адукацыі студэнты-аграрыі маюць магчымасць атрымаць і ваенны білет

**Новае папаўненне ва Узброеных Сілах ужо больш за месяц як прыняло воінскую прысягу. Учарашнія прызыўнікі прайшлі курс маладога байца, цяпер у іх — баявая падрыхтоўка: ваеннаслужачыя спасцігаюць армейскую навуку як у вучэбных класах, так і на стрэльбішчах, палігонах. Сярод іх ёсць і тыя, хто асвойвае ваенна-ўліковую спецыяльнасць па паскоранай праграме: падчас сваіх летніх канікулаў студэнты аграрных ВНУ праходзяць воінскую службу ў рэзерве.**

Гэта своеасаблівы эксперымент. Упершыню за гісторыю Узброеных Сіл Беларусі студэнтам вышэйшых навучальных устаноў сельскагаспадарчага профілю прапанавалі падчас летніх канікулаў адслужыць у войску. Згодна з Указам Прэзідэнта, дадзеная катэгорыя грамадзян мае права прайсці службу ў рэзерве. Тры гады (пасля першага, другога і трэцяга курсаў) усяго па месяцу-паўтара ў арміі — і ў маладога чалавека пасля заканчэння ВНУ будзе на руках не толькі дыплом аб вышэйшай адукацыі, а і ваенны білет.

### Прапанова, ад якой нельга адмовіцца

Пакуль новаўвядзенне датычыцца толькі спецыялістаў-аграрыяў. Каб даведацца, ці многія з іх пагадзіліся падчас вучобы ва ўніверсітэце вырашыць сваё пытанне з арміяй, карэспандэнты «Звязды» накіраваліся ў 2-ю інжынерную брыгаду — менавіта там да нясення воінскай службы прыступілі студэнты сельскагаспадарчых ВНУ з усёй краіны. У эксперыментальным узводзе — 50 чалавек.

— З першых дзён, калі хлопцы трапілі ў армейскае асяроддзе, яны дакладна рэагуюць на пастаўленыя задачы, — расказвае **намеснік начальніка збораў рэзерву па ідэалагічнай рабоце капітан Уладзімір ШЧУЦКІ.** — Некаторыя навабранцы часам скардзяцца, што ім цяжка вывучыць тыя ж абавязкі ваеннаслужачага. У вайскоўцаў-аграрыяў такога няма. Маладыя людзі вучацца ў вышэйшых навучальных установах, многія з іх жывуць у інтэрнатах, таму да навучальнага працэсу і дысцыпліны яны ўжо прызвычаіліся. Правільна ўмеюць прыняць інфармацыю, класіфікаваць яе і ўмела прымяніць на практыцы. Ёсць сярод маладых людзей і відавочныя лідары: у хлопцаў блішчаць вочы, яны ўвесь час хочуць нешта рабіць, праяўляюць ініцыятыву.




Ніхто з іх, дарэчы, не шкадуе, што свае планы на лета яны добраахвотна памянялі. Студэнты адразу ж пагадзіліся на такі від службы — дзе яшчэ ёсць магчымасць за такі кароткі тэрмін, без адрыву ад навучальнага працэсу і родных вырашыць сваё пытанне з арміяй?!

Не доўга думаў і студэнт Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, якая знаходзіцца ў Горках Магілёўскай вобласці, Аляксандр Вялы.

— Усе ў сям'і — і дзядуля, і бацька — служылі па паўтара-два гады, а мне выпаў шчаслівы білет, — пераканаы малады чалавек, які скончыў першы курс. — Некаторыя мае аднагрупнікі не пажадалі дзеля службы ў войску ахвяраваць летам, для мяне ж гэта — выдатны варыянт, прапанова, ад якой нельга адмовіцца. Дарэчы, у вайсковай часці да нас вельмі добра адносяцца: на некаторыя моманты закрываюць вочы, выслухваюць, раяць, як паступіць у той ці іншай сітуацыі.

Вайсковец рэзерву прызнаецца, што ў параўнанні з вучобай у акадэміі, у арміі яму лягчэй. Праграма, па яго словах, не складаная, а ўсё, што звязана з баявой падрыхтоўкай, — увогуле вельмі цікава. Адзінае, да чаго яшчэ трэба прызвычаіцца, дык гэта да фізічных нагрузак, але і тут малады чалавек бачыць плюс — быць заўсёды ў спартыўнай форме. «А яшчэ армія вучыць чалавека цаніць і пераасэнсоўваць многія рэчы: адносіны з сям'ёй, ежу, свабодны час», — прызнаецца Аляксандр.

Міхаіл Булачка, таксама студэнт горацкай акадэміі, з самага дзяцінства марыў пабываць у ваенна-патрыятычным лагеры, пастраляць з аўтамата Калашнікава, пакідаць гранаты. Не давялося. Калі быў малы, не з'явілася такой магчымасці, калі ж падрос, планы на лета ў звычайнага вясковага хлопца сталі прадказальныя — Міхаіл з ранніх гадоў у сваім калгасе браў удзел ва ўборачнай кампаніі. Жніво было запланавана і на гэтае лета, але ўзнікла справа больш важная — служба ў войску.

— Яшчэ будзе час і папрацаваць, і адпачыць, цяпер жа нельга ўпускаць такую магчымасць, — мяркуе малады чалавек, калі гаворыць пра прапанову адслужыць падчас летніх канікулаў. — Мой старэйшы брат, які служыў традыцыйныя паўтара года, мне па-добраму зайздросціць.

Міхаіл адчувае сябе ў войску абсалютна камфортна. Ён і ў цывільным жыцці прачынаецца рана, не позна кладзецца спаць. Да дысцыпліны таксама прызвычаіўся з дзяцінства, у самастойнае жыццё ўжо ўцягнуўся пасля года жыцця ў інтэрнаце. Больш за тое, пасля заканчэння ВНУ Міхаіл збіраецца зноў вярнуцца ў войска, каб працягнуць сваю службу па кантракце. На яго погляд, гэта найбольш выгадна, чым ісці адпрацоўваць па размеркаванні ў калгас.

### Служба насычаная

Яшчэ адзін студэнт ВНУ сельскагаспадарчага профілю Арцём Перабейнас, які да службы ў войску займаўся грэка-рымскай барацьбой, кажа, што фізічныя нагрузкі ў арміі зусім не складаныя. І да рэжыму прызвычайваешся хутка: калі кладзешся ў дзесяць вечара, то зусім не складана прачнуцца ў 6.00.

— Мне вельмі спадабалася, калі мы ездзілі на стрэльбішча, — дзеліцца ўражаннямі будучы аграрый. — Напэўна, няма такіх хлопцаў, якія б не марылі патрымаць у руках зброю, а тым больш пастраляць з яе. Нам паказваюць сапраўдную ваенную тэхніку, тлумачаць прынцып яе работы. З нецярпеннем чакаю, калі будзем унікаць у падрыўную справу.

Неўзабаве навабранцы ўжо прыступяць да вывучэння сваёй ваенна-ўліковай спецыяльнасці: усе студэнты-аграрыі будуць сапёрамі. Гэта радавая пасада сярэднестатыстычнага салдата, якая не прадугледжвае працяглага навучання, а час у дадзенай катэгорыі ваеннаслужачых — на вагу золата. Цяпер яны асвойваюць пачатковы курс ваеннай падрыхтоўкі: вучаць агульнавайсковыя статуты, удасканальваюць страявую, страляюць з аўтамата Калашнікава. Акрамя таго, у іх праходзяць заняткі па радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароне, спасцігаюць юнакі і тонкасці ваеннай тапаграфіі — усё згодна са стандартным цыклам падрыхтоўкі любога вайскоўца.

Іван Гашко вучыцца ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце. Са сваімі бацькамі ён адразу вырашыў, што лепш тры гады запар схадзіць у войска і адслужыць па месяцу-паўтара, чым пасля ўніверсітэта, страчваючы сваю кваліфікацыю, ісці ў армію на цэлы год.

Акрамя таго, малады чалавек — з дынастыі міліцыянераў. Таму «касіць ад службы», на яго думку, было б сорамна. Але ён пра гэта нават ніколі не задумваўся, таму з задавальненнем пагадзіўся падчас летніх канікулаў на ўласным вопыце зведаць, што такое салдацкае жыццё.

— Гэта вельмі цікава, калі ты трапляеш у абсалютна іншую для сябе атмасферу, дысцыпліну, робіш тое, чым дагэтуль ніколі не займаўся, — перакананы Іван Гашко. — Служба вельмі насычаная: мы не толькі развіваем свой кругагляд, вучымся новаму, а і атрымліваем дадатковую спецыяльнасць — у выніку пасля заканчэння ўніверсітэта будзем мець дзве прафесіі.



— Дзядуля, маёр запасу, і бабуля, у мінулым — ваенны фельчар, лічаць, што ў любым выпадку кожны мужчына павінен прайсці гэтую школу жыцця, — гаворыць салдат. — Я ўвогуле не маю права падвесці сваю сям'ю. Яшчэ жыве мой прадзед-ветэран Яўген Ванькевіч, які быў партызанам, а пасля вызвалення Беларусі трапіў у войска і дайшоў да Берліна. Другі мой прадзед, Аляксандр Партарэзкаў, якога я мала памятаю, у гады вайны вазіў на паўтаратонцы па «Дарозе жыцця» харчаванне, аднойчы ўзяў у палон нямецкага афіцэра, за што атрымаў узнагароду, — увогуле ўвесь яго кіцель быў у ордэнах і медалях.

Пакуль такая магчымасць захоўваецца. Указ аб новым прызыве на тэрміновую вайсковую службу і службу ў рэзерве кіраўніком дзяржавы ўжо падпісаны. Маладыя людзі, якія вучацца ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю або збіраюцца туды паступаць, як і героі публікацыі, могуць вырашыць сваё пытанне з арміяй хутчэй, чым яны думалі.

**Фота Юліі АЛЕКСЕНКІ, «Ваяр».**

**Матэрыялы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**